3. Районный ресурсный центр по духовно-нравственному воспитанию [Электронный ресурс] — Режим доступа: http://gymnaz2vileiyka.edu.minskregion.by/index.php?articleId=17020&blogId=6&op=ViewArticle. — Дата доступа: 03.12.2019.
4. Содержание работы ресурсного центра по духовно-нравственному воспитанию школьников [Электронный ресурс]— Режим доступа: https://sch6.slutsk-vedy.gov.by — Дата доступа: 02.12.2019.

***Іваненка Мікалай Міхайлавіч***
*намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце ДУА «Вілейская гімназія № 2»*

# Праблемы пераемнасці пакаленняў у кантэксце духоўна-маральнага дыскурсу

Выраз «Если бы молодость знала, если бы старость могла» (фр.: Sijeunesse savait, si vieillesse pouvait) з эпіграммы французкага пісьменніка 16 стагоддзя Анры Эцьена стагодзямі прымушае задумацца над сваім зместам шматлікія пакленні людзей. З цягам часу не знікае праблема «Як аб'яднаць адвагу пешкі і здольнасці ферзя?», не знікаюць і пошукі такога існавання, каб дапытлівы розум, сіла і няўрымслівасць маладосці маглі ісці поруч і ў еднасці з мудрым вопытам старасці на карысць не толькі дабрабыту грамадства, але і духоўнасці. Пераемнасць пакаленняў можна разглядаць па многіх аспектах: сацыяльны, эканамічны, палітычны, культурны, бытавы, псіхалагічны, этнічны і інш. Асобна вызначаецца духоўна-маральны аспект — асноўны ва ўсіх сферах жыццядзейнасці чалавека, ад яго якасна залежаць ўсе астатнія. Мы ведаем, што вялікія цывілізацыі самазнішчаліся, калі мараль і духоўнасць грамадства прыходзілі ў заняпад, і, нягледзячы на гэта, працягваем жыць бяспечна. Накоплены вопыт папярэдніх пакаленняў менш за ўсё падвяргаецца крытычнаму асэнсаванню ў матэрыяльных сферах жыцця і больш за ўсё ў духоўных. Відавочна, як узрастае адказнасць асобы, якая занятая ў духоўна-маральнай сферы. Асабісты прыклад — гэта аснова выхавання. Як бы бацькі, светары, настаўнікі, прыгожа ні гаварылі, а калі словы разыходзяцца з жыццём — марныя намаганні.

Адным з важных фактараў працэса пераемнасці духоўных каштоўнасцей з'яўляюцца традыцыі фарміравання маральнасці канкрэтнага соцыума. Па словах даследчыцы Т.І.Кухаронак, асновы маральнасці фарміруюцца ў кожнага народа на працягу доўгага часу і складаюць важнейшую частку духоўнага жыцця [4, 167]. Духоўнае жыццё (малітоўнае яднанне з Богам, уважлівае назіранне за свім унутраным «я», удзел у Царкоўных таінствах, вывучэнне Свяшчэннага Пісання і вопыту святых, справы міласэрнасці) становіцца гарантам, дапамагае чалавеку з падацельнага стану прыйсці ў непадацельны, калі ён зможа беспамылкова вызначаць дабро і зло, не толькі свядома выбіраць дабро, але і падсвядома цягнуцца да дабра. Духоўнае жыццё — сінэргія (супрацоўніцтва) Бога і чалавека ў імя чалавека. Бо чалавек, страціўшы сувязь з Богам, становіцца падобны на электрычны прыбор, адключаны ад разеткі [7, 118-121].

Не так шмат сярод нас людзей, якія шчыра скажуць, што не вераць у Бога. Але жыццё паказвае зусім іншыя вынікі. Свяціцель Мікалай Сербскі казаў: «Не пытайцеся ў хрысціяніна ці верыць ён у Бога, а пытайцеся, ці верыць у Евангелле. Бо калі скажа, што верыць па свайму разуменню, а не па Евангеллю, то ён язычнік…» [8, 8]. Трэба сказаць, што хрысціяніну неабходна ўстрымлівацца ад вельмі многага з таго, што звычайна не лічыцца кепскім. Ці пазбаўляе нас жыццёвых радасцяў хрысціянская вера, калі многія нашы радасці мы звязваем не проста з дабрабытам, а з багаццем? Людзі казалі: «Калі ёсць хлеб і вада, то гэта не бяда» [1, 203]; а Евангелле словамі Хрыста папярэджвае: «Лягчэй вярблюду прайсці праз іголньнае вушка, чым багатаму ўвайсці ў Царства Божае» [6, 45]. Мы павінны імкнуцца да вартага жыцця, і, абмяжоўваючы сябе матэрыяльна, не асуджаць тых, хто не ўваходзіць у рамкі нашых уяўленняў пра праведнасць. Сумленне, як своеасаблівы «антывіруснік», дадзенае Богам кожнаму чалавеку, можна ўмацоўваць дабрадзейным жыццём і малітвай, і тады яно зможа адсочваць самыя маленькія пагрэшнасці, даючы чалавеку моцныя імпульсы пры набліжэнні нават грахоўнай думкі. Але ж сумленне можна і ўсыпіць бесталковым, грэшным жыццём, і тады яно перастане вылучаць і самыя грубыя грахі.

Пазнаючы сябе ў барацьбе з заганамі і жывучы жыццём сапраўды духоўным, чалавек прыходзіць да радаснага ўтаймавання і лагоднасці, якія з’яўляюцца праваднікамі Божай любові ў яго душу. Той любові, якая дапаможа выканаць запавет Хрыста: «А я кажу вам: любіце ворагаў вашых, благаслаўляйце тых, хто праклінае вас, рабіце дабро тым, хто ненавідзіць вас, і маліцеся за тых, хто крыўдзіць вас і гоніць вас» [6, 12]. Менавіта такі стан не прыніжае чалавечай годнасці і не робіць яго рабом, як з усіх сваіх сіл даказвае нашым дзецям сучасны свет, а робіць чалавека па-сапраўднаму вольным і велікадушным. Пераемнасць паміж пакаленнямі ў духоўна-маральным аспекце не мае пажаданых вынікаў таму, што не хапае любові. Без любові ўсё — нішто: справядлівасць робіць чалавека жорсткім, адказнасць — бесцырымонным, праўда — крытыканам, розум — хітрым, прыветлівасць робіцца крывадушнай, кампетэнтнасць падводзіць да няўступлівасці, улада без любові пераўтварае чалавека ў тырана, гонар робіць яго высакамерным, абавязковасць прыводзіць да раздражнення, багацце да прагнасці, вера да фанатызму. Так Апостал Правел у сваім Пасланні да Карынфян падкрэслівае: «Калі маю дар прароцтва, і валодаю ўсімі тайнамі і ўсімі ведамі, і маю ўсю веру, так што магу і горы перастаўляць, а любові не маю, то я — нішто» [6, 390].

Усе парасткі, у тым ліку і парасткі любові, зараджаюцца ў сям’і. Каб выхаваць добрых дзяцей, трэбы быць строгім. Шматвекавы вопыт продкаў падказвае: «Наказвай сына з дзяцінства — парадуешся за яго, калі вырасце, і сярод тых, хто зычыць табе зла зможаш пахваліцца ім, і пазайздросцяць табе ворагі твае» [3, 38]. У Старым Запавеце шмат разоў даволі канкрэтна гаворыцца пра неабходнасць пакарання: «Хто шкадуе дубца свайго, той

ненавідзіць сына, а хто любіць, той з дзяцінства наказвае яго» [Прытчы 13:25]. Так, трэба быць строгім, але нежорсткім. Апостал Павел вучыць нас разважлівасці ў выхаванні: «І вы, бацькі, не раздражняйце дзяцей вашых, а выхоўвайце іх у вучэнні і настаўленні Гасподнім» [6, 434].

Вялікі рускі вучоны, медык, псіхолаг і педагог П.Ф. Лесгафт сцвярджае, што станоўчае выхаванне асобы (здатнай прыняць ад папярэднікаў і перадаць нашчадкам неабходны для жыцця на зямлі і ў вечнасці комплекс духоўна-маральных каштоўнасцей) не магчыма без стварэння належных умоў: атмасфера любові; высокамаральныя выхавацелі; рэгулярная радасная грамадска-карысная праца; адсутнасць празмернага багацця або беднаты, азартных гульняў, спіртных напояў, табакі і т.п.; гарманічнае развіццё (музыка, літаратура, фізічная культура, маляванне, шахматы і г.д.); паслядоўнасць у навучанні і выхаванні; адсутнасць кантактаў з амаральнымі людзьмі [5, 86]. У большасці сучасных сем'яў пераважае тры нехрысціянскія падыходы да выхавання: абыякавасць да дзяцей, жорсткасць у адносінах да іх і празмернае ўсхваленне. Ігумен Яўменій у кнізе «Анамаліі бацькоўскай любові» вызначае чатыры групы праблем: адсутнасць кантактаў з дзецьмі; падкрэслена непаважлівыя адносіны дзяцей да сваіх бацькоў; празмерная трывога за дзяцей; праблемы, звязаныя з нестандартнымі паводзінамі дзяцей, іх залежнасцю ад шкодных звычак і інш. [2, 14]. Гэтыя праблемы выцякаюць з няправільнага жыцця саміх бацькоў. Нашым сучасным дзецям вельмі не хапае дастойных прыкладаў жыцця дарослых.


1. Аксамітаў, А. Прыказкі і прымаўкі: Тлумач. слоўн. бел. прыказак і прымавак з арх., кафедр. збораў, рэд. выд. XIX і XX стст. / А. Аксамітаў. — 2-е выд., дапрац. — Мінск: Бел. навука, 2002. — 320 с.
2. Анамалии родительской любви / Игумен Евмений. — М.: Свет Православия, 2005. — Электронная библиотека RoyalLib.com [Электронный ресурс] / Режим доступа: https://royallib.com/book/lesgaft_pyotr/semeynoe_vospitanie_rebenka_i_ego_znachenie.html. — Дата доступа: 21.12.2018.
3. Домострой: Как устроить свой быт богоугодно, а жизнь свято / Ред. В. Горсков. — М.: Паломник, 2002. — 256 с.
4. Кухаронак, Т.І. Маральныя асновы жыццядзейнасці традыцыйнай сялянскай сям'і беларусаў / Т.І. Кухаронак // Традиции православной духовности в нравственном воспитании и предупреждении семейного неблагополучия: сборник докладов X Свято-Евфросиниевских педагогических чтений. — Минск: Пачатковая школа, 2008. — С. 167-169.
5. Лесгафт, П.Ф. Семейное воспитание ребенка и его значение: Настольная книга родителей и педагогов / П.Ф. Лесгафт. — М.: Издательский дом «Педагогика», 1991. — Электронная библиотека RoyalLib.com [Электронный ресурс] / Режим доступа: https://royallib.com/book/lesgaft_pyotr/semeynoe_vospitanie_rebenka_i_ego_znachenie.html. — Дата доступа: 20.12.2018.
6. Новы Запавет Госпада нашага Ісуса Хрыста / Пераклад з грэчаскай на сучасную беларускую мову Біблейскай камісіі Беларускай Праваслаўнай Царквы; адказны рэдактар пе-

ракладу протаіерэй Сергій Гардун. — Мінск: Прыход Свята-Петра-Паўлаўскага сабора: Медыял, 2017. — 544 с.
7. Пестов, Н.Е. Опыт построения христианского миросозерцания: в 2 т. — Т.2: Современная практика православного благочестия / Н.Е. Пестов. — СПб: Сатисъ, 2000. — 664 с.
8. Сто слов о вере Святителя Николая Сербского (Велимировича) / перевод с сербского Н. Феофановой. — М.: Издательство Сретенского монастыря, 2002. — 48 с.

***Каврига Димитрий Игоревич***
*иерей, лицензиат канонического права, преподаватель Минской духовной академии*

## «Социальное учение» как одна из основных форм деятельности II Ватиканского собора

Второй Ватиканский собор — XXI Вселенский Собор Католической церкви, открытый по инициативе папы Иоанна XXIII в 1962 и продолжавшийся до 1965 года, собор закрылся уже при папе Павле VI. На соборе был принят ряд важных документов, относящихся к церковной жизни — 4 конституции, 9 декретов и 3 декларации, в том числе и по вопросу восстановления единства христиан [2, с.268-275].

Открывая собор 11 октября 1962, Иоанн XXIII заявил, что целью Собора является обновление Церкви и её разумная реорганизация, чтобы Церковь могла продемонстрировать своё понимание развития мира и подключилась к этому процессу. Папа высказал пожелание, чтобы результатом этого Собора стала открытая миру Церковь.

Задачей Собора было не отвергать и осуждать реалии современного мира, а провести давно назревшие реформы [3].

Социальная доктрина католицизма представлена прежде всего в документах Второго Ватиканского собора, и особенно в Пастырской конституции «О Церкви в современном мире» («Гаудимум ет спес», 1965), и «О церкви» («Дэ Экклезия», 1965).

Идеи, представленные в них получили свое дальнейшее развитие в официальных документах пап, среди которых можно выделить энциклику Павла VI «Популюм прогрессио» (1967), а также «Бог, богатый милосердием» («Дивес ин мизекордия», 1980), «Совершая труд» («Лаборем эксерценс», 1981), «Забота о социальной действительности» («Соллицитудо реи социалис», 1987), «Сотый год» («Центезимус аннус», 1991), «Суть в единстве» («Ут унум синт», 1995) и др. Иоанна Павла II.

Выражение «Социальная доктрина Церкви» восходит к Пию XI и обозначает доктринальный «корпус», касающийся евангелизации социального измерения, которое, начиная с энциклики Льва XIII «Rerum novarum», разработанной в Церкви через Учение Пап и епископов в общении друг с другом. Точнее, как пишет «Компендиум социальной доктрины Церкви»: «Социальная доктрина принадлежит Церкви, потому что Церковь — это субъект, который ее разрабатывает, распространяет и учит.